УДК 2

# НЕРУХОМАЯ МАЁМАСЦЬ БЫХАЎСКАГА КАСЦЁЛА Ў XVII–XVIII стст.

**Галынскі Раман Дзмітрыевіч,**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (г. Магілёў, Беларусь)

*Быхаўскі касцёл канонікаў рэгулярных лютэранскіх Беззаганнага зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны, Святога Казіміра і Святога біскупа доктара Аўгустына фундатарамі быў надзелены нерухмай маёмасцю. У артыкуле робіцца агляд гэтай маёмасці на падставе касцёльнай інвентарнай кнігі 1747 г.*

Кожная рэлігійная абшчына мела пэўную колькасць нерухомай маёмасці – сюды ўваходзілі як зямля на якой размяшчаўся галоўны будынак, так і тэрыторыі з якіх збіраліся падаткі і ахвяраванні прыхажан. Быхаўскі касцёл канонікаў рэгулярных лютэранскіх Беззаганнага зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны, Святога Казіміра і Святога біскупа доктара Аўгустына не з'яўляецца выключэннем. Нажаль не выпадае казаць пра наяўнасць вялікай колькасці пісьмовых крыніц якія б маглі распавесці пра



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

гісторыю згаданага касцёла, не гаворачы ўжо пра яго эканамічнае становішча. Але ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваюцца тры інвентары касцёла. Найбольш падрабязным з'яўляецца інвентарны вопіс 1747 г., дакумент утрымлівае звесткі пра разнастайную маёмасць, а ў некаторых выпадках і пра яе паходжанне.

Сярод дакументаў якія пералічаны ў інвентары, прыведзены: даравальныя граматы ад караля Жыгімонта III Вазы (1631 г.), лісты якія рэгламентуюць валоданне вёскамі Залатва і Лубянка (1646, 1670 і 1718 гг.) [1, с. 20-20а], права на валоданне юрыдыкамі[1] ад Казіміра Сапегі (ваявода Віленскі 1682-1703, 1705-1720 гг.), дакументы на плошчы і моргі[2] сенажатныя ад розных асоб, паперы на валоданне фальваркам Белая Гара [1, с. 22; 4]. Сярод будынкаў якія выкарыстоўваліся як месцы захоўвання пэўнай рухомай маёмасці, згадваюцца кухня, вазоўня, стайня, бровар, піўніца [1, с. 24б], акрамя таго – студня [1, с. 25].

Казімірам Сапегам быў падараваны фальварак Белая Гара. Пералік будынкаў фальварка часткова супадае з раней згаданымі пабудовамі. Так менавіта ў апісанні фальварка прыведзены наступныя збудаванні: свіран, стайня для коней, сад і агарод з плотам і форткай, пекарня (на момант напісання інвентару пустая), сені і пекарня (якая выкарыстоўвалася), каморка і сені ў якіх размешчана кухня "да белай ізбы". З "белай ізбы" камора да спіжарні, піўніца і лазня. Потым згадваюцца стадола і бровар. Акрамя комплекса сельска-гаспадарых і жылых пабудоў да фальварка адносілася яшчэ зямля, агульнай плошчай 1 валока і 5 моргаў [1, с. 25].

Асобны аркуш прысвечаны пераліку юрыдыкаў. Першыя зямельныя плошчы абшчынай былі атрыманы ад графа Яна Караля Хадкевіча. Тэрыторыя прадмесця (магчыма пасада) за Магілёўскай брамай "placow - 6" [1, с. 25b], на гэтай тэрыторыі знаходзілася "dla uslugi coscielney" было 24 дамы, на момант складання інвентара засталося 14, з якіх два пуставалі. Акрамя таго, ад Яна Караля Хадкевіча касцёл атрымаў сенажаць у 10 моргаў плошчай за паўмілі ад Быхава.

Сенажаць у 6 моргаў і "dom nazwany Faykowski" былі падараваныя Ежы Сапегам (калі той быў стольнікам Вялікага княства Літоўскага 1686-1703, 1709-1732 гг.). Дом ацэньваўся ў 2000 тынфаў [1, с. 25b].

Згадваюцца два дамы ў самім Быхаве (ў межах абарончых умацаванняў) [1, с. 25b]. Акрамя таго, у маёмасці, але без дакументаў пацвярджаючых правы на яе, прыведзены два дамы ў Быхаве і зямля за "Прадмесцем Быхаўскім". Зямля, дарэчы, у 1747 г. адыйшла замку [1, с. 25b].

Паза ўвагай засталася зямля на якой быў пабудаваны сам касцёл. З таго ж інвентара вядома, што першапачатковым фундатарам касцёла з'яўляўся Ян Караль Хадкевіч (датай заснавання лічыцца 1619 г.). Менавіта ён і падараваў зямлю, але цікава тое, што, ён пачаў перабудову быхаўскага замка – новы каменны замак будаваўся на новым месцы. Хутчэй за ўсё тэрыторыя, на якой стаяў стары драўляна-земляны замакХадкевіч і аддаў пад будаўніцтва касцёла, бо іншай замлі ва ўласным валоданні ў яго магло папросту і ня быць.

Сам будынак касцёла з кірхай, званніцай і агароджай былі каменныя. Пра гэта сведчыць гравура Л. Куўро, якая датуецца сярэдзінай XVII ст. [5, с. 16-24]. Будынкі цярпелі ад пажараў і аблог, аб чым сведчаць археалагічныя матэрыялы (гарэлая кафля і слаі пажарышчаў).

Такім чынам выпадае казаць пра пэўны комплекс нерухомай маёмасці якая належала Быхаўскаму касцёлу канонікаў рэгулярных лютэранскіх Беззаганнага

[1] Юрыдыкі – адміністрацыйна адасобленыя часткі гарадоў ці прадмесцяў, якія былі пад уладай феадала, царквы, або манастыра і на жыхароў якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада гарадскога самкіравання [2, с. 772].

[2] Морг – зямельная мера роўная 0,7123 га [3, с. 319-320].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зачацця Найсвяцейшай Марыі Панны, Святога Казіміра і Святога біскупа доктара Аўгустына. Абшчына валодала як зямлёй (сенажаці, палеткі, сад і агарод), так і юрыдыкамі ў горадзе на якіх знаходзіліся будынкі, вёскамі Лубянка і, магчыма Залатва (апошняя згадваецца ў шэрагу судовых спраў як зямельных, так і крымінальных), фальваркам Белая Гара. Да прамысловых будынкаў можна аднесці бровары, пекарні, магчыма, спіжарню (пры акалічнасці, што гэта месца для вырабу і апрацоўкі каляровых металаў), шматлікія дадатковыя памяшканні (стайні, піўніцы, свірны і інш.). Наяўнасць прыгонных давала як натуральную прадукцыю, так і працоўныя рукі. Нерухомая маёмасць у горадзе магла здавацца ў арэнду і выкарыстоўваца ў залежнасці ад патрэб. Гэта ж датычыцца і сенажацяў з палеткамі.

## Літаратура


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 2395. Воп. 1. Спр. 7.
2. Капыскі, З. Юрыдыкі / З.Капыскі // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2007. – 2-е выд. – 792 с. : іл. – С. 722.
3. Анішанка, Я. Морг / Я. Анішчанка // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2007. – 2-е выд. – 792 с. : іл. – С. 319-320.
4. Спецыяльная мапа Заходняй часткі Расійскай імперыі генерал-лейтэнанта Шуберта 1826-1840 гг.
5. Волкаў, М.А. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. / М.А. Волкаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 5. – С. 16-24.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова